СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ЗГОДА

ГРАМАДСКА – ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

май 1993

N 8 (14)

КОШТ 5 РУБ.

ЧАСТКА ТЫРАЖУ — ПА СВАБОДНЫХ ЦЭНАХ

КАКОЙ БЫТЬ НАШЕЙ КОНСТИТУЦИИ?

Одним из наиболее спорных вопросов государственного строительства Республики Беларусь встал вопрос о президентстве, точнее — о полномочиях президента, его месте и роли в государственных структурах. В парламенте, как и за его стенами, сформировались две противоположные точки зрения. Одни хотели бы видеть «сильного» президента, который был бы не только главой государства, но и возглавил бы правительство (по американскому образцу). Другие предлагают германский вариант, где президент обладает скорее морально-политической силой, чем реальной властью, и выполняет протокольные функции.

Партия народного согласия предлагает третий вариант, где «сильный» президент соседствует с полномочным правительством, подчиняющимся больше парламенту, чем президенту. Президент же не вмешивается в текущую политику, особенно хозяйственную, но служит гарантом Конституции, законности и суверенитета страны. Сегодня мы публикуем раздел из проекта Конституции Беларуси, подготовленного Партией народного согласия.

ПРЕЗИДЕНТ РЕСПУБЛИКИ

Ст.1. Президент республики является Главой государства и Первым представителем белорусского народа во внутренних делах и внешних сношениях.

Президент республики является гарантом соблюдения Конституции, законов, международных договоров и соглашений.

Ст.2. Президент республики избирается непосредственно белорусским народом на пять лет.

Выборы проводятся не позднее, чем за 30 дней до истечения срока полномочий предыдущего Президента.

Ст.3. Президент избирается абсолютным большинством поданных голосов (5 % + 1 голос). Если никто из претендентов не наберет нужного количества голосов, ровно через неделю проводится второй тур голосования, в котором участвуют только два претендента, получившие наибольшее количество голосов в первом туре. Если один из этих претендентов снимет свою кандидатуру, в выборах имеет право участвовать претендент, занявший 3-е место. Аналогичный механизм применяется, если свою кандидатуру будут снимать претенденты, занявшие последующие места (вместо 3-го — 4-ый и т. д.).

Ст.4. В случае вакансии поста Президента его функции исполняет Председатель парламента (Верховного Совета, Сойма), а если последний не сможет их выполнять — Председатель Конституционного суда.

Ст.5. При досрочном освобождении поста Президента новые выборы проводятся не позднее, чем через 30 дней после открытия вакансии.

Ст.6. Президент может быть досрочно освобожден от должности в случае совершения им преступления или иного поступка, не совместимого с его постом в результате специальной процедуры (импичмент). Данная процедура представляет собой следующее: обвинение Президенту может быть предъявлено лишь группой депутатов в количестве не менее 1/5 от общего их числа, решение о недоверии может быть вынесено лишь абсолютным большинством всех депутатов. Решение об освобождении Президента от должности выносит Конституционный суд не позднее, чем через 3 дня после решения парламента о виновности Президента.

Ст.7. Президентом может быть избран любой белорусский гражданин или гражданка, достигшие 35 лет.

(Окончание на 2-й стр.)


НАВІНКІ ЭКАНОМІКІ

Імпарт далікатэсаў у I квартале б. г.

Назва тавара	Колькасць	Цана за тону (у доларах)	Краіна-пастаўшчык	Сусветныя цэны
Кава	47 т	16 213	Польшча	927
Кава	5 т	5 600	Швейцарыя	927
Гарбата	5 т	4 400	Польшча	2 000
Пшаніца	2 т	500	Польшча	145
Алей	34 000 т	477	Германія	477
Алей	38 т	1 474	Польшча	477
Цукар	415 т	848	Куба	250
Цукар	105 т	400	Балгарыя	250
Цукар	5 769 т	391	Польшча	250
Цукар	60 т	367	Кітай	250
Цукар	24 000 т	293	Аўстрыя	250
Какава	25 т	1 640	Афганістан	1 640
Какава	9 т	3 444	Польшча	1 640

Беларусы, відаць, выбіліся ў вельмі багатыя людзі, калі дазваляюць сабе піць каву ў 20 разоў даражэйшую, чым у Францыі ці Германіі, з цукрам у тры разы даражэйшым, чым у Заходняй Еўропе. Віншуем!

Па матэрыялах Дзяржкамітэта і газеты «Биржи и банки» N 18, 1993 г.



КАКОЙ БЫТЬ НАШЕЙ КОНСТИТУЦИИ?

ПРЕЗИДЕНТ РЕСПУБЛИКИ

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Ст.8. Президент может избираться на свою должность не более двух раз и общий срок пребывания на этом посту не может превышать десяти лет.

Ст.9. Президент республики назначает Председателя Совета Министров сообразуясь с тем, пользуется ли назначенное им лицо поддержкой парламента.

Ст.10. Президент подписывает все законы, принятые парламентом, за исключением актов, касающихся работы парламента. В случае его отказа от подписи, парламент должен в течение месяца подтвердить свое решение большинством голосов всех членов парламента. В последнем случае Президент обязан подписать принятый парламентом закон.

Ст.11. Президент от имени республики подписывает международные договоры и соглашения с иностранными государствами, которые подлежат потом обязательной ратификации парламентом.

Ст.12. В пределах своих полномочий Президент издает президентские Указы. Перечень данных полномочий устанавливается специальным законом.

Ст.13. Президент назначает должностных лиц на государственные посты согласно перечню, утвержденному специальным законом.

Ст.14. Президент назначает глав дипломатических представительств Беларуси, принимает верительные грамоты иностранных дипломатических представителей.

Ст.15. Президент является главой вооруженных сил республики.

Ст.16. Президент награждается знаками отличия республики.

Ст.17. Президент осуществляет право помилования и отсрочки исполнения приговора или судебного решения.

Ст.18. Президент может вносить законопроекты в парламент, которые должны быть рассмотрены в течение 3-х дней после внесения.

Ст.19. В случаях, предусмотренных Конституцией, Президент объявляет проведение референдума.

Ст.20. Пост Президента не совместим с иной должностью или занятием. Президент на срок своих полномочий приостанавливает членство в политической партии.

Ст.21. Течение президентского срока начинается со дня принятия Присяги. Текст Присяги утверждается парламентом.

Ст.22. Президент может направлять в парламент президентские послания, которые зачитываются на сессии.

Президент может в любое время выступить в парламенте с речью или сообщением.

Ст.23. Президент получает ежемесячное вознаграждение, сумма которого устанавливается законом. Президент имеет право на официальную резиденцию, служебную квартиру, средства транспорта, связи и охрану. Указанные права Президента регламентируются специальным законом.

При достижении пенсионного возраста бывший Президент получает пенсию в размере 80% от должностного оклада.

Ст.24. Президент может в любое время подать в отставку.

Ст.25. Президент ежегодно проходит медицинскую комиссию, которая дает заключение о его возможности полноценно выполнять президентские функции. Члены медицинской комиссии назначаются одной из комиссий парламента. Бюллетень о состоянии здоровья Президента публикуется в печати. Кандидаты на должность Президента представляют медицинское заключение о физическом и психическом состоянии здоровья.

Ст.26. Президент не может принимать подарки (за исключением подарков от членов семьи) или какие либо денежные вознаграждения без разрешения парламента.

НАТАТКІ ПАЛІТОЛАГА

ФАКТАР РЫЗЫКІ

З гісторыі вядома, што бяда чакае тую дзяржаву, дзе палітычныя групоўкі ва ўзаемным саперніцтве спрабуюць абапірацца на знешнія сілы.

ГІСТОРЫЯ ПАПЯРЭДЖВАЕ

Нагадаем, што менавіта так 200 гадоў назад загінула Рэч Паспалітая. Правячая каталіцкая большасць дамагалася звесці рахункі з «дысідэнтамі», праваслаўнымі і пратэстантамі, а тыя шукалі падтрымкі ў праваслаўнай Расіі і пратэстанцкай Прусіі. Прыхільнікі дэмакратычных рэформ па прыкладу рэвалюцыйнай Францыі дабіліся прыняцця прагрэсіўнай канстытуцыі 3 мая 1791 года, а магнаты-кансерватары (і каталікі, і «дысідэнты») апелявалі да кансерватыўных манархаў суседніх краін і з іх дапамогай вынішчылі «рэвалюцыйную крамолу» на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Польшчы. Але якой цаной? Ваяўнічыя суседзі падзялілі паміж сабой Рэч Паспалітую. Гэта наш айчынны вопыт.

І гэта не ўсё. Рэвалюцыйная завіруха 1917 г. закруціла на беларускай зямлі карусель чужаземных «освободителей»: бальшавікоў-інтэрнацыяналістаў, кайзераўцаў, пілсудчыкаў. Знаходзіліся тутэйшыя, гатовыя ўслужыць кожнаму з «освободителей», а тыя некалькі разоў дзялілі і перадзельвалі Беларусь. І ніхто з іх не браў пад увагу інтарэсы і волю насельніцтва гэтай краіны.

ЗНЕШНІ ФАКТАР І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ БЕЛАРУСІ

І сёння, не паспела яшчэ прыцішыцца эйфарыя з нагоды абвяшчэння незалежнасці Беларусі, а знешні фактар усё мацней укліньваецца ў кола ўнутраных праблем і супярэчнасцей. На палітычнай сцэне вызначаюцца групоўкі, якія дзеля дасягнення сваіх палітычных мэт гатовыя скарыстаць дапамогу іншых дзяржаў. А цана за такую дапамогу можа быць высокая — незалежнасць. Адносіны з суседнімі краінамі ўтрымліваюць у сабе фактар рызыкі для існавання беларускай дзяржаўнасці.

Пэўныя палітычныя колы і не хаваюць, што хацелі б рэстаўрацыі БССР у складзе СССР. Чырвона-зялёныя сцягі на мітынгах і дэманстрацыях — яскравае таму сведчанне. Галоўным аргументам тут застаюцца вынікі рэферэндуму ў сакавіку 1991 года, падчас якога большасць грамадзян выказалася за захаванне СССР, а значыць не настойвала на незалежнасці сваёй рэспублікі. І як бы мы не трактавалі той рэферэндум, ён застаецца вялікім аргументам у палітычных спрэчках і, можна спадзявацца, будзе яшчэ не раз выкарыстоўвацца тымі, хто вяртанне ў мінулае лічыць лепшай дарогай да прагрэсу.

Ёсць у нас і свае прыхільнікі «единой и неделимой России», у складзе якой, на іх думку, абавязкова павінна заставацца і «Белая Русь».

Іншая частка тутэйшых была б задаволена, каб можна было замяніць назву Беларусь на «Крэсы всходне», іх галасы прагучалі нядаўна на адным з грамадскіх форумаў, у Гародні.

Справа незалежнасці Беларусі, як бачым, надалей застаецца актуальнай для яе грамадска-палітычнага жыцця. Здаецца, занадта лёгка дасталася нам незалежнасць, і ўсведамленне яе грамадствам як найвышэйшай нацыянальнай каштоўнасці сёння выглядае яшчэ незавершаным працэсам. Адсюль вынікае няпэўнасць агульнай сітуацыі ў Беларусі і нейкая абыякавасць да палітычнага жыцця ў часткі насельніцтва. І сапраўды, ці варта нам спрачацца паміж сабой аб характары эканамічных пераўтварэнняў, калі ўсё можа вырашацца ў Маскве? Ці варта Беларусі мець свайго прэзідэнта, калі яна ўвойдзе ў склад федэрацыі альбо канфедэрацыі, а там прэзідэнт і без нас знойдзецца? І так амаль у кожнай справе дзяржаўнага значэння. Няпэўнасць міжнароднага становішча ўяўляе сабой не толькі фактар рызыкі для незалежнасці Беларусі, але і ва ўсіх іншых сферах, жыццёва важных для народа краіны.

Кожная палітыка ў такіх абставінах — гэта гульня ў палітыку, гульня з лёсам дзесяці мільёнаў людзей. Асобныя эпізоды гэтай гульні мы бачылі на чарговай сесіі Вярхоўнага Савета ў красавіку бягучага года, калі раптам зусім нечаргова ўсплыло пытанне, якое падзяліла людзей на два лагеры: тых, хто «за», і тых, хто «супраць». Пры тым, што палітыкі, узняўшыя пытанне, дамагаліся нечага зусім іншага, але знешні фактар стаў у той гульні казырнай картай. Іншыя сюжэты падобных гульняў перадае тэлебачанне з Закаўказзя, Босніі і Герцэгавіны...

РЭФЕРЭНДУМ

Адна з галоўных прычын знешнепалітычнай нестабільнасці Беларусі — у адсутнасці трывалых падмуркаў сучаснай дзяржаўнасці. Збудаваць прававыя і маральныя падмуркі новапаўсталай дзяржавы можна толькі ўсеагульным рэферэндумам, няхай спозненым, але, на нашу думку, вельмі патрэбным. І калі быць у Беларусі рэферэндуму па знешнепалітычных справах, то ў бюлетэнь трэба запісаць першачарговае пытанне: **«Ці павінна Беларусь назаўсёды заставацца незалежнай дзяржавай!»**

Зварот улад да грамадзян менавіта з такім пытаннем меў бы шмат падстаў. Па-першае, адмяніць, нейтралізаваць альбо замацаваць вынікі папярэдняга рэферэндуму могуць толькі вынікі новага апытання. Дый увогуле, мы збіраемся будаваць не толькі надзейную, але і дэмакратычную дзяржаву, і з гэтай рацыі пачынаць будаўніцтва лагічна б было з выяўлення волі народа.

Мабыць, нямнога знойдзецца палітыкаў, якія б сумняваліся ў тым, што большасць насельніцтва Беларусі выкажацца за незалежнасць. Усе, хто не мае нейкіх спецыяльных палітычных інтарэсаў, ужо зразумелі, што назад дарогі няма, што на абшарах былога СССР нам няма на каго спадзявацца, што трэба самастойна вырашаць лёс сваёй рэспублікі, свой лёс, лёс сваіх дзяцей.

Але афіцыйнае галасаванне за незалежнасць з'явілася б для кожнага грамадзяніна экзаменам на патрыятызм, на сталасць і развагу. Кожны з нас павінен узяць частку адказнасці за лёс краіны. Ідэя, у нашым выпадку — ідэя незалежнай, дэмакратычнай і заможнай дзяржавы, — калі яна авалодае свядомасцю людзей, можа стаць, як слушна пісаў вядомы ўсім нам класік, сур'ёзнай матэрыяльнай сілай. Дзяржаўны патрыятызм насельніцтва месціцца сярод першых крыніц заможнасці найбольш багатых краін сучаснага свету.

КАЛІДОР ДЛЯ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ, СТАБІЛЬНАСЦЬ ДЛЯ ЎНУТРАНАЙ

Замацаванне незалежнасці праз рэферэндум вызначыла б калідор для знешней палітыкі ўладавых структур. Такія захады, як міждзяржаўныя пагадненні, заключэнне саюзаў і ўваходжанне ў блокі альбо прыхільнасць да нейтралітэту, змяшчаюцца ў гэтым калідоры, а ўваходжанне ў федэрацыю ці канфедэрыцыю — ужо не. Рэферэндум па прапанаванаму пытанню паўстаў бы надзейнай заслонай супраць чыіх бы ні было палітычных гульняў з беларускай дзяржаўнасцю. Здаецца, гэта было адобрана і ў большасці замежных краін.


Праўда, з трыбуны парламента ўжо прагучала іншая фармуліроўка пытання на рэферэндум, фармуліроўка, у якой на паспалітае рашэнне выносяцца адносіны да нейтралітэту Беларусі і да ўваходжання ў палітычныя блокі і саюзы. Вопыт міжнародных адносін, практыка дыпламатычнай працы адназначна сцвярджаюць немэтазгоднасць усенароднага галасавання па пытаннях, якія належаць да бягучай палітыкі, ды яшчэ да вельмі далікатнай яе сферы. Голас аднаго высокакваліфікаванага спецыяліста ў такіх пытаннях павінен лічыцца больш важкім, чым лес рук галасуючых. Вынікі рэферэндуму тут не могуць быць канчатковым рашэннем, бо заключэнне палітычных саюзаў, як і дасягненне статусу нейтральнай дзяржавы, — гэта справа дзвюх — і шматбаковых перамоў, справа, дзе перамяжоўваюцца інтарэсы многіх краін і народаў.

Аргументы і разважанні на гэту тэму можна было б доўжыць. Дарэчы, былі б тут варыянтныя прагнозы развіцця палітычнай сітуацыі ў Еўропе, а перш за ўсё — імператывы, якімі кіруюцца іншыя краіны ў адносінах да Беларусі. Паліталагічнымі аналізамі і прадбачаннямі карыстаюцца палітыкі і дыпламаты кожнай цывілізаванай краіны. На жаль, прафесіянальны ўзровень беларускай знешняй палітыкі яшчэ не патрабуе паслуг навукі.

І нарэшце, паспрабуем уявіць сабе сітуацыю, калі б народ выказаўся, скажам, за нейтралітэт, а міжнародныя абставіны раптам прымусілі Беларусь да нейкага ваенна-палітычнага саюзу. Што тады рабіць уладам: маланкава праводзіць новы рэферэндум ці проста праігнараваць вынікі папярэдняга? Застаецца спадзявацца, што фармуліроўка пытання на рэферэндум, прапанаваная старшынёй Вярхоўнага Савета ва ўмовах вострай палітычнай палемікі, будзе ім жа адазвана. Не можа быць вялікай перашкодай на шляху да рэферэндуму і прыняты раней закон аб усенародным галасаванні, дзе яшчэ на хвалях эйфарыі ад суверэнітэту ўведзены пэўныя абмежаванні зместу пытанняў, па якім народ мог бы выказаць сваю волю. Парламент мае выключнае права трактаваць законы і ўносіць у іх змест папраўкі, якіх патрабуе жыццё і здаровы сэнс.

Леанід ЛОЙКА

ЗАВОД В ОТПУСКЕ



Около трех тысяч рабочих Гомельского завода измерительных приборов с пятого апреля оказались без работы и зарплаты. Некогда стабильное предприятие приблизилось к краю финансовой пропасти из-за набивших уже оскомину причин — разрыва экономических связей между республиками бывшего Союза, непомерного роста цен на металл и энергоносители, неупорядоченности налоговой системы в собственной республике. Подобная печальная участь грозит в ближайшей перспективе коллективам объединения «Гидроавтоматика», Светлогорского «Химволокно», завода «Электроаппаратура» и ряду других предприятий Гомельщины, которые уже давно работают в половину производственных мощностей.

Виктор КОТОВ,
Гомель

ПНЗ: ХРОНІКА

Гарадская арганізацыя падводзіць вынікі. Прайшоў год пасля стварэння Мінскай гарадской арганізацыі ПНЗ. На справаздачным сходзе 20 красавіка былі падведзены вынікі яе работы.

У справаздачы старшыня гарадскога Савета Уладзімір Бажанаў заначыў, што члены гарадской арганізацыі ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і абмеркаванні «Канцэпцыі ПНЗ аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці ў Рэспубліцы Беларусь», праекта «Закона аб выбарах». Гэтыя дакументы былі афіцыйна ўнесены на абмеркаванне ў Вярхоўны Савет. Члены гарадской арганізацыі прынялі ўдзел у прапагандзе ідэі аб стварэнні ў рэспубліцы пры пэўных умовах кааліцыйнага ўрада, у падрыхтоўцы і правядзенні восенню 1992 г. у парку імя Горкага свята газеты «Згода». Члены Савета правялі сустрэчы з кіраўніцтвам гарадской арганізацыі БНФ, Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі, Беларускім згуртаваннем вайскоўцаў.

Прамоўца з задавальненнем адзначыў плённую прапагандысцкую і тэарэтычную работу рэдакцыі газеты «Згода», пэўны колькасны рост гарадской арганізацыі, іншыя станоўчыя моманты ў яе дзейнасці.

Але ці задаволены дакладчык і выступіўшыя ў спрэчках зробленым гарадской арганізацыяй і партыяй у цэлым? На іх думку, дзейнасць партыі пакуль у асноўным сканцэнтравана ў кіруючых органах, у мерапрыемствах прымае ўдзел адносна невялікая колькасць яе членаў і прыхільнікаў. Не толькі насельніцтва, але і многія члены партыі недастаткова інфармуюцца аб рабоце і гарадской арганізацыяй, і кіраўніцтва ПНЗ. Не надаецца дастатковай увагі пашырэнню партыйных радоў, удасканаленню форм і метадаў дзейнасці па месцу жыхарства, ў працоўных калектывах, сярод студэнцкай і працуючай моладзі. Прамоўцы гаварылі аб неабходнасці стварэння моцных і баяздольных рэгіянальных і пярвічных арганізацый, напаўненні іх дзейнасці канкрэтнымі справамі.

Удзельнікі сходу абмеркавалі палітычную сітуацыю ў Беларусі, работу Вярхоўнага Савета і ўрада. Адзначалася неабходнасць ужо ў бліжэйшы тэрмін распрацаваць перадвыбарную платформу, вызначыць ад партыі магчымых кандыдатаў у дэпутаты, стварыць прапагандысцкія групы для іх падтрымкі на перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў, устанавіць неабходныя кантакты з прадстаўнікамі блізкіх да нас палітычных партый, грамадскіх рухаў, прафсаюзаў.

Абраны новы састаў гарадскога Савета. Яго кіраўніком стаў кандыдат эканамічных навук, дацэнт **Мікалай Дрозд**, намеснікамі — дацэнт **Валянцін Уладзіміраў**, настаўніца сярэдняй школы **Вольга Кашлатая**, сакратаром — **Нэлі Скавародкіна.**

Іван СТАДУБ

ПНЗ: ДАБРАБЫТ, НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, ЗГОДА!

ВЯРХОЎНЫ САВЕТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

Старшыні камісіі па заканадаўству сп. Дзмітрыю Булахаву

Выканком Партыі народнай згоды прапануе вынесці на ўсенароднае галасаванне пытанне:

«Ці згодны Вы з тым, каб Беларусь назаўсёды заставалася незалежнай дзяржавай!»

Зварот Вярхоўнага Савета да грамадзян рэспублікі менавіта з такім пытаннем меў бы, на нашу думку, сур'ёзныя падставы. **Па-першае**, ён зняў бы супярэчнасці паміж вынікамі папярэдняга рэферэндуму (17 сакавіка 1991 г.) і рэальным становішчам Беларусі, узмацніў бы прававыя і маральныя падмуркі беларускай дзяржаўнасці. **Па-другое**, пры станоўчым адказе насельніцтва Беларусі на гэта пытанне (у чым мы не сумняваемся) будуць канчаткова перакрэслены аргументы і планы тых грамадска-палітычных груповак, якія дамагаюцца рэстаўрацыі БССР у складзе СССР, альбо ўваходжання Беларусі цяпер ці ў будучыні ў склад нейкай іншай дзяржавы. **Па-трэцяе**, рэферэндум па пытанню аб незалежнасці станоўча адаб'ецца на міжнародным аўтарытэце новапаўсталай дзяржавы. **Па-чацвёртае**, усенароднае галасаванне паспрыяе ўзросту патрыятызму грамадзян, асабістай адказнасці за лёс Радзімы.

Разам з тым, Выканком Партыі народнай згоды хацеў бы звярнуць увагу народных дэпутатаў на немэтазгоднасць вынясення на рэферэндум пытанняў бягучай палітыкі, да якіх, безумоўна, адносяцца падпісанне міжнародных умоў, далучэнне альбо недалучэнне да двух- ці шматбаковых пагадненняў, арыентацыі на нейтралітэт ці адмова ад яго. Міжнародныя адносіны занадта далікатная сфера палітыкі і было б згубным уцягваць увесь народ у дыскусіі і спрэчкі па пытаннях, якія вырашаюцца не галасаваннем, а шляхам перамоў з урадамі іншых краін.

Прапануем вынесці на рэферэндум таксама пытанне:

«Ці згодны Вы на правядзенне выбараў у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь не пазней сакавіка 1994 г.!»

Просім унесці наш варыянт пытанняў на рэферэндум на абмеркаванне сесіі Вярхоўнага Савета.

Выканком Партыі народнай згоды.

05.04.1993 г. г.Мінск

На майской (1993 г.) сессии Верховного Совета Республики Беларусь ожидается принятие Закона «Об именных приватизационных чековых книжках в Республике Беларусь». Тем самым завершается создание правовой базы и открывается путь для проведения широкой приватизации государственной собственности. Начнется этап коренных социально-экономических преобразований, которые во многом определят дальнейшее развитие общества, судьбу каждой семьи, каждого человека.

К сожалению, принятие законодательных актов, регулирующих формирование рыночных

ЗАЯВЛЕНИЕ ФЕДЕРАЦИИ ПРОФСОЮЗОВ БЕЛАРУСИ И ПАРТИИ НАРОДНОГО СОГЛАСИЯ

О РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИИ И ПРИВАТИЗАЦИИ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ

отношений, происходит без глубокого социально-экономического обоснования целесообразности принимаемых решений, в обстановке жесткого идеологического противостояния сторонников и противников реформ. Все чаще разгосударствление и приватизация рассматриваются как цель, а не средство для подъема экономики республики. Предпринимаются попытки отстранения трудовых коллективов и представляющих их интересы профсоюзов от участия в определении дальнейшей судьбы имущества предприятий. Это создает возможность передела национального богатства Беларуси в интересах коррумпированных групп, обостряет социальные противоречия в обществе.

Широкие консультации, проведенные Федерацией профсоюзов Беларуси и Партией народного согласия с представителями трудовых коллективов, науки, деловых кругов, опыт других стран показывают, что приватизация имеет смысл лишь тогда, когда она подчинена повышению эффективности производства, увеличению выпуска и повышению качества промышленных товаров и продовольствия, обеспечению занятости и росту жизненного уровня населения.

Убеждены, что на ближайшее время необходимо сохранить в собственности государства ядро научно-промышленного комплекса республики. Это обеспечит стабильность в обществе, даст возможность гибкой корректировки экономических программ в ходе их реализации. В то же время следует всемерно содействовать быстрейшей адаптации государственных предприятий к работе в рыночных условиях, внедрению арендных отношений, развитию коллективных, коллективно-долевых форм собственности, производственного предпринимательства.

Поддерживая идею первоначального наделения граждан фиксированной долей государственной собственности, полагаем необходимым при разработке соответствующих нормативно- правовых актов рассмотреть все альтернативные предложения, включая введение приватизационных счетов, а также учесть отрицательные последствия ваучеризации в России с целью создания оптимального, надежного и четко контролируемого механизма преобразования собственности.

Настаиваем также на безусловном законодательном обеспечении приоритетности решения трудовых коллективов о целесообразности той или иной формы приватизации, сроках и способах ее осуществления, обязательности общественного контроля на всех этапах разгосударствления и приватизации.

Необходимо закрепить в нормативных документах положение о том, что включение предприятий в перечень приватизируемых объектов принимается только при условии согласия более двух третей членов трудового коллектива. Свободная продажа предприятий с аукциона или по конкурсу возможна лишь при отказе его работников взять в аренду или выкупить и при наличии у потенциального покупателя обоснованной программы развития данного предприятия.

Считаем, что повышение роли трудовых коллективов в определении судьбы своих предприятий позволит предотвратить дальнейшее расхищение материальных ценностей под предлогом приватизации.

Призываем Верховный Совет и правительство республики проявить ответственный подход и политическую мудрость при осуществлении реформ, подчинить их интересам граждан Беларуси, обеспечить укрепление национальной экономики и согласие в обществе.

Председатель Федерации профсоюзов Беларуси
В. И. Гончарик

Председатель Партии народного согласия
Г. Д. Карпенко

ПНЗ: ХРОНІКА

На пасяджэнні выканкома 5 мая заслухана інфармацыя Аляксандра Алпеева аб праведзенай арганізацыйнай рабоце па павелічэнню колькаснага складу ПНЗ. За апошнія два месяцы рады ПНЗ павялічыліся больш чым на сорак арганізацый і груп падтрымкі. Гэта сведчыць аб росце папулярнасці ідэй і прапаноў партыі. Значную ролю ў гэтым накірунку адыгрываюць друкаваны орган ПНЗ газета «Згода», а таксама выступленні ў рэспубліканскіх сродках масавай інфармацыі членаў партыі.

Пасля працяглай дыскусіі пацверджана фармулёўка пытання, якое прапануецца вынесці на ўсенароднае галасаванне ў час правядзення рэферэндуму: «Ці згодны Вы з тым, каб Беларусь назаўсёды заставалася незалежнай дзяржавай?» Разам з абгрунтаваннем яно накіравана Старшыні камісіі Вярхоўнага Савета па заканадаўству сп. Дз. Булахаву.

У склад камісіі па падрыхтоўцы пытанняў для рэферэндуму рэкамендаваны член Выканкома Леанід Лойка.

* * *

На Каардынацыйнай нарадзе дэмакратычных і патрыятычных сіл абмеркавана і прынята заява адносна маючага адбыцца ўсенароднага галасавання. Большасць яе ўдзельнікаў падтрымала прапанову старшыні Вярхоўнага Савета сп. С. Шушкевіча аб правядзенні абавязковага рэспубліканскага рэферэндуму па вызначэнню пазіцыі насельніцтва да ваенна-палітычнага саюза з другімі дзяржавамі (ПНЗ прапанавала іншае пытанне). У заяве патрабуецца таксама адмяніць незаконную пастанову Вярхоўнага Савета ад 29 кастрычніка 1992 г., якая адмовіла правесці рэферэндум аб датэрміновым роспуску парламента і нечарговых выбарах, за якія выказалася больш чым 440 тысяч грамадзян рэспублікі. Прапанавана правесці нечарговыя выбары ў Вярхоўны Савет не пазней сакавіка 1994 г.

* * *

11 мая адбалося чарговае пасяджэнне Каардынацыйнай нарады патрыятычных і дэмакратычных сіл.

Прадстаўнікі Беларускага згуртавання вайскоўцаў паведамілі аб загадзе міністра абароны П. Казлоўскага аб звальненні з войска падпалкоўніка Міколы Статкевіча, кіраўніка БЗВ, за быццам бы палітычную дзейнасць. Удзельнікі нарады аднагалосна падтрымалі прапанову аб выступленні ў сродках масавай інфармацыі з заявай у абарону сп. М. Статкевіча.

Разгледжаны пытанні аб інстытуце прэзідэнта ў рэспубліцы і праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях і грамадска-палітычных арганізацыях (рухах) Рэспублікі Беларусь». З інфармацыяй па гэтых пытаннях выступіў намеснік старшыні АДПБ Міхась Пліско. Большасць палітычных партый Беларусі, як высветлілася, падтрымлівае ідэю стварэння інстытута прэзідэнта. Прысутныя адобрылі асноўныя палажэнні праекта закона аб палітычных партыях і грамадска-палітычных арганізацыях.

Іван СТАДУБ

Па ініцыятыве рэдакцыі газеты «Згода» і кафедры міжнародных адносін Белдзяржуніверсітэта 21 красавіка ў Доме Дружбы адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь: праблемы і перспектывы». Апрача вучоных-палітолагаў у ёй прынялі ўдзел народныя дэпутаты, работнікі Міністэрства знешніх спраў, Дзяржаўнага камітэта па знешнеэканамічных сувязях, актывісты грамадскіх арганізацый.

На канферэнцыі выявіліся некалькі падыходаў да знешняй палітыкі Беларусі. Большасць прысутных (акрамя, зразумела, супрацоўнікаў МЗС) крытычна ацэньвалі вынікі знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі. Мела месца палеміка паміж прыхільнікамі нейтралітэту Беларусі і тымі, хто адмоўна ставіцца да яго.

З цікавасцю былі ўспрыняты прысутнымі выступленні народнага дэпутата Г. Казлова, прафесараў БДУ І. Сачанкі, А. Чэлядзінскага, А. Мазалава, навуковага супрацоўніка АН Беларусі Д. Панамарова, загадчыка аддзела МЗС В. Шчаснага. Ад рэдакцыі «Згоды» на канферэнцыі з дакладам «Беларусь — мост паміж Усходам і Захадам» выступіў Л. Лойка.

Навукова-практычная канферэнцыя яскрава паказала, што ўрадавыя структуры зусім беспадстаўна ігнаруюць вопыт і веды беларускіх вучоных-міжнароднікаў і палітолагаў. Можа, менавіта таму знешнепалітычная канцэпцыя Рэспублікі Беларусь так востра крытыкуецца і ў парламенце, і ў прэсе Беларусі.



СВЕТА В ТОННЕЛЕ НЕТ,

ИЛИ О ТОМ, ЧЕГО ЖДУТ НА ОДНОМ ИЗ ПРЕДПРИЯТИЙ БелОМО

«Згода» уже дважды обращалась к социальным и экономическим проблемам Минского механического завода им. С. И. Вавилова, который входит в объединение БелОМО. Сегодня вниманию читателей предлагается материал с Рогачевского завода «Диапроектор» на эту же тему. Входя в одно и то же объединение, как и завод им. С. И. Вавилова, предприятие не только не избежало тех же проблем, но и оказалось на грани банкротства. О причинах такого положения и пойдет речь.

Мой собеседник — председатель недавно созданного на этом предприятии профкома профсоюзов Конфедерации труда Владимир Михайлович Усов. Он один из тех людей на заводе, кто с болью в сердце переживает трудности, пытается что-то изменить, предпринять.

— Владимир Михайлович, почему же руководство завода не торопится с конверсией, с перепрофилированием предприятий на выпуск другой продукции!

— Причин такого состояния много. Но, пожалуй, главная — в консерватизме руководителей предприятия. Наш завод входил в систему Министерства обороны бывшего Союза. И в ней легко было жить и работать, выделяемых средств хватало на все нужные и ненужные работы. Поэтому с конверсией не спешили, хотя должна она была проводиться уже не первый год. Многие ждали и ждут возврата к прежней экономике и политике. Сегодня завод продолжает выпускать почти тот же ассортимент, что и десять лет назад. Естественно, что сбыта они не находят. Склады переполнены. Тот «мизер», который реализуется, не покрывает затрат живой силы и сырья. Завод крепко влез в кабалу кредитов. В общей сложности их уже больше полмиллиарда рублей. «Низы» пока выжидают, что из этого получится, а «верхи» спешно осуществляют личные коммерческие поездки в Польшу, зарабатывая капитал для приватизации, «эффективно» руководя малыми предприятиями на собственном заводе, выпуская запчасти для «Жигулей».

— Как же встретили на предприятии появление нового профкома и за какие проблемы вы взялись в первую очередь!

— Даже слышать о нас не хотели долгое время, не то что признавать за нами какие-то права. Поэтому прежде всего стали отстаивать право человека на труд, бороться против увольнений. А их уже к первой половине прошлого года было немало: на 610 человек уменьшился коллектив предприятия к 1 августа, к 1 января нынешнего года руководство планировало сократить, хотя и прикрываясь термином «временно», еще около 700 человек. Совет предприятия, «официальный» профком охотно поддерживают такие «рыночные» мероприятия, ибо в их составе преобладает руководящий персонал. Вместе с тем на предприятии упорно продолжают придерживаться прежних структур управления, охраны завода как военного объекта. Здесь сотни людей ничем не заняты. А денег на их содержание уходит больше, чем на рабочего у станка. С этими вопросами идут члены нашего профсоюза к людям.

По нашей просьбе Республиканской проектно-экспертной службой Конфедерации труда Беларуси была сделана экспертиза Устава предприятия. Коротко отмечу, что он оставляет руководству много «лазеек» для работы по принципу «тяп-ляп». В то же время коллектив не может полностью осуществить своих полномочий. Отсутствуют важнейшие положения и в коллективном договоре. Кстати, он уже должен быть принят на этот год, но никто не торопится. Члены нашего профсоюза О. М. Прокопенко, И. И. Ворочков, И. П. Бычков развернули работу по быстрейшему созыву конференции трудового коллектива и принятию коллективного договора. Нами подготовлен и альтернативный его вариант.

— Владимир Михайлович, видимо, не только эти вопросы составляют круг забот вашего профсоюза!

— Вы правы. Люди идут к нам не только по поводу увольнений, зарплаты, но и большей частью по вопросам жилья. С вхождением завода в полосу кризиса, строительство его практически прекратилось. Я не сказал бы, что у нас нет на заводе инициативных людей. Но без поддержки руководства, профкомов и у них ничего не получится. Чтобы завершить начатое строительство жилья, руководители завода уже два раза ездили в Совмин просить денег. Может, что-то и будет выделено, но это не спасет положения. Мы считаем, что можно было бы использовать средства, полученные от приватизации заводского жилья, кредиты банков, другие возможные поступления. Но не сидеть сложа руки, как это происходит сейчас. Руководство и прежде всего директор предприятия М. Г. Железнов пытаются всякий раз успокоить людей, рассказывая о мнимых проектах по выпуску новых изделий, а организационных шагов не предпринимают.

— Словом, Владимир Михайлович, положение на вашем предприятии полностью похоже на то, в котором сейчас очутились все коллективы объединения БелОМО!

— Не могу ответить за остальных, но на Рогачевском заводе «Диапроектор» положение угрожающее. Заработная плата составляет 60 — 70 процентов к той, что получают на Минском заводе, больше у нас и увольнений. Что удивляет, так это безразличие к нашим бедам и руководства объединения, и местных властей. Поэтому в нынешней ситуации рассчитываем только на собственные силы.

Вместо послесловия. Таким образом, если подытожить все три публикации в «Згодзе», то ясна, пожалуй, картина в целом по объединению БелОМО. Эта отрасль очутилась в глубочайшем кризисе из-за нерасторопности бывших и нынешних руководителей. Конверсия проводится только на словах, продолжается выпуск никому не нужных товаров, скажем тех же диапроекторов Рогачевского завода. Не благоприятствует и помощь республиканских властей. Принципы приватизации больших предприятий как следует не отработаны. Народ психологически не принимает тех решений по этой проблеме, которые приняты Верховным Советом. Надежд на свет в конце тоннеля пока нет.

С. ЛИСОВСКИЙ

ДАЗВОЛЬЦЕ ЎСТАВІЦЬ ТРЫ СЛОВЫ

Прайшоў ужо пэўны час з таго моманту, калі наша дзяржава абвясціла аб сваёй незалежнасці. Ці выйшла за гэты час Беларусь на шлях рэформ, ці знайшла сваё месца сярод іншых краін?

Адказы гучаць розныя. Некаторыя эканамісты нават загаварылі аб нейкім «беларускім варыянце» шляху да рыначнай эканомікі, без болю і шоку. Падставай для такіх сцвярджэнняў паслужылі пэўныя эканамічныя паказчыкі, адносна стабільная палітычная сітуацыя. Урад Беларусі з усіх магчымых варыянтаў рыначных рэформ выбраў праграму паступовай перабудовы эканомікі пры жорсткім кіраванні з боку дзяржаўных органаў усяго рэфармацыйнага працэсу. Галоўнай мэтай урада было не дапусціць сацыяльнага выбуху, што, здаецца, яму і ўдалося.

Але ўсё вышэй названае не дае падставы гаварыць аб тым, што Беларусь наблізілася да выхаду з крызіснага становішча. Мысленне нашага парламента і ўрада засталося па-ранейшаму «правінцыяльным». Лепшыя ў параўнанні з іншымі краінамі былога СССР паказчыкі былі дасягнуты Беларуссю толькі за кошт захавання традыцыйных эканамічных сувязяў з Расіяй. У той жа час краіны Балтыі, Украіна праводзілі палітыку пераходу да самазабеспячэння і энергазамяшчэння. Таму эканамічны спад у названых краінах, выкліканы такімі абставінамі, бачыцца як часовы. У хуткім часе можа аказацца так, што Балтыя і Украіна апярэдзяць і Беларусь, і іншыя дзяржавы СНД па тэмпах эканамічнага развіцця. Беларусь жа заставалася і застаецца эканамічна залежнай ад Расіі, у першую чаргу з нагоды недахопу энергетычных і сыравінных рэсурсаў.

Сярод іншых рэспублік былога СССР Беларусі была адведзена роля «зборачнага цэха». Адмоўнага ў тым нямала, аднак ёсць і станоўчае: наша дзяржава атрымала ў выніку добры навукова-тэхнічны патэнцыял і нядрэнныя тэхналогіі перапрацоўкі, асабліва ў хімічнай, машынабудаўнічай галінах. Чаго ж тады шкадаваць, што мы не сыравінная дзяржава? Ва ўсім свеце вядома, што прамысловыя вырабы заўсёды каштуюць даражэй за простую сыравіну. Таму, на маю думку, беларускай прамысловасці трэба як мага хутчэй пераходзіць на энерга- і рэсурсазберагаючыя тэхналогіі і рэалізаваць свой неблагі навукова-тэхнічны патэнцыял у канкрэтныя эканамічныя рэформы.


Пэўнымі арыенцірамі для Беларусі на шляху да рэформ могуць быць прыклады краін Балтыі, Польшчы і Украіны з безумоўнай карэкцыяй і ўлікам спецыфікі беларускай эканомікі. Кіраўнікам буйных прадпрыемстваў нельга разлічваць на тое, што Расія будзе яшчэ доўгі час клапаціцца аб нашых прамысловых гігантах і падкармліваць іх сваімі заказамі. Эканамічная арыентацыя толькі на Расію небяспечна і тым, што яна мала стымулюе вытворчасць якаснай прадукцыі і кансервуе нашу тэхналогію, вымушае нашых прамыслоўцаў шукаць «лёгкага хлеба» і губляць час, усё больш і больш адстаючы ад перадавых краін Захаду. На жаль, ёсць ужо такія сімптомы падзення зацікаўленасці ў кантактах з краінамі Еўропы. Нельга забываць, што за эканамічнай залежнасцю з'яўляецца і залежнасць палітычная. Відавочна, што толькі фармальна сталіца СНД знаходзіцца ў Мінску, а фактычна як і раней усім кіруе «рука Масквы».

Але ж усё больш і больш відаць палітычная эфемернасць СНД, якая адыграла станоўчую ролю ў пераходны перыяд і цяпер павінна адысці ў гісторыю. Усе намаганні захаваць гэты саюз толькі зацягваюць яго агонію, бо аплот СНД — Расія сама паступова трансфармуецца ў канфедэрацыю. Пры гэтым выклікаюць здзіўленне такія акты беларускага парламента, як далучэнне да ўсім «вядомага» «Дагавора аб калектыўнай бяспецы», патрэбнага больш Расіі, яе Узброеным Сілам і нашаму паважанаму ваеннаму кіраўніцтву, якое не зацікаўлена ў скарачэнні ўзброення і нейтралітэце Рэспублікі Беларусь.

Так, можна і далей рабіць выгляд, што мы незалежная дзяржава заяўляць аб імкненні да нейтралітэту, а на самай справе мець на сваёй тэрыторыі ядзерную зброю і заключаць пагадненні аб ваенным супрацоўніцтве з дзяржавай праваперааемніцай «імперыі зла» і ўсё больш і больш набліжацца да статуса рэспублікі ў складзе Расійскай Федэрацыі.

І. ГРЫНЕВІЧ,

студэнт 3-га курса гістарычнага факультэта БДУ



Заснавальнікі:
Партыя народнай згоды, калектыў рэдакцыі.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не абавязкова супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Тэлефоны:
Леанід ЛОЙКА (рэдактар) — 32-35-94;
супрацоўнікі рэдакцыі:
Аляксей КАРОЛЬ — 32-01-84;
Ігар РЫЖКОЎ— 32-04-31.

Рэдакцыйная калегія
Наш адрас:
220041, Мінск,
праспект
Ф. Скарыны, 79.

Друкарня «Перамога», 222310, Маладзечна, вул. Таўлая, 11. Індэкс 63138, тыраж 7000 экз. Зак. 599 . Ліцэнзія ЛВ N 135